Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Пытанне-адказ

ЦІ ВАРТА ПРЫМАЦЬ СТАЦІНЫ?

Мне 55 гадоў. Раней быў высокі халестэрын. Урач прызначаў стаціны. Я іх прымала на працягу трох месяцаў. Халестэрын знізіўся, і я перастала іх прымаць. Зараз зноў халестэрын падняўся да 6,4 ммоль/л. Ці трэба прымаць стаціны? Сёння шмат інфармацыі ў інтэрнэце пра гэтыя прэпараты, сустракаецца нават меркаванне, што лепш пакутаваць ад сардэчнага прыступу, чым ад разбурэння печані.

Таццяна Андрэева, *г. Мінск.*

Адказвае загадчык аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска) Арына БАСАВА.

— Пытанне вельмі шматграннае, бо пры прызначэнні стацінаў улічваецца мноства акалічнасцяў. Узрост, пол пацыента, а таксама спадарожныя фактары, якія абцяжарваюць праходжанне сардэчна-сасудзістай хваробы. У прыватнасці, гэта спадчыннасць (ці пакутавалі бацькі на сардэчна-сасудзістыя хваробы), наяўнасць цукровага дыябету ў самога пацыента і ў блізкіх сваякоў, шкодныя звычкі, асабліва курэнне, павышаная маса цела, наяўнасць гіпертаніі. Гэтыя дадатковыя фактары рызыкі ўрач заўсёды даследуе і ацэньвае. Сёння да дадатковых фактараў рызыкі сардэчна-сасудзістых хвароб аднеслі і раннюю менапаўзу ў жанчын. І калі мы высвятляем з дапамогай апытання пацыента, яго аналізаў і даных аб'ектыўных метадаў абследавання, што чалавек адносіцца да высокай ці вельмі высокай групы рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў, то стаціны яму трэба прымаць пастаянна, без перапынкаў, і імкнуцца да ўзроўню агульнага халестэрыну 4,5—5 ммоль/л. Акрамя гэтага, кардыёлагі звяртаюць увагу на такі паказчык, як ліпапратэіны нізкай шчыльнасці (папросту «дрэнны» халестэрын). Ён павінен быць у межах 2 ммоль/л (а пры вельмі высокай групе рызыкі сардэчна-сасудзістых хвароб і ўвогуле менш за 1,8).

Таму калі жанчына адносіцца да высокай ці вельмі высокай групы рызыкі, яна мае патрэбу ў пажыццёвым прыёме інгібітараў HMG-CoA-рэдуктазы, або стацінаў. Калі рызыка ўмераная і гарманальны фон у норме, то тут магчымая карэкцыя ладу жыцця, у прыватнасці гіпадынаміі (маларухавасці) ці харчавання. Але падыход вельмі індывідуальны, і ў такой сітуацыі неабходна наведаць урача. Толькі пры асабістым кантакце, абследаваўшы пацыента, мы можам рэкамендаваць схему лячэння.

Дапамога

Дабрачынны праект па дыягностыцы зроку «Я бачу!» пачаў сваю сёлетнюю работу ў Віцебскай вобласці. За год урачы-афтальмолагі агледзяць 14 тысяч сельскіх школьнікаў з 19 раёнаў.

ШАНУЙ ЗРОК ЗАМАЛАДА!

Праект рэалізуецца ў два этапы. Да канца мая мабільныя брыгады афтальмолагаў будуць працаваць у вясковых школах Аршанскага, Дубровенскага, Бешанковіцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага і Расонскага раёнаў. А пасля летніх канікул — у перыяд з верасня да снежня — прыедуць у Талачынскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Гарадоцкі, Віцебскі, Мёрскі, Ушацкі, Шаркаўшчынскі, Шумілінскі, Полацкі і Лепельскі раёны. З сакавіка ўрачы ўжо агледзелі 1413 дзяцей у Сенненскім і Верхнядзвінскім раёнах.

Такая праверка вучняў 1—11-х класаў паказала, што ў 37,6 % з іх ёсць парушэнні зроку. У акулярнай карэкцыі мелі патрэбу 204 школьнікі. Агляды па месцы вучобы дазваляюць своечасова заўважыць праблемы са зрокам і аператыўна прызначыць неабходнае лячэнне.

Віцебская вобласць стала чацвёртай, дзе рэалізуецца сумесны праект Беларускага дзіцячага фонду і кампаніі velcom / A1 пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя. Для эфектыўнай работы выязных брыгад арганізатары забяспечылі неабходным партатыўным абсталяваннем два аўтамабілі. У залежнасці ад вынікаў агляду і ўстаноўленага дыягназу школьнікі атрымліваюць рэцэпты на акуляры ці неабходныя медыкаменты, а таксама рэкамендацыі і карысныя парады па захаванні зроку і правільным зрокавым рэжыме. Пры неабходнасці дзяцей накіроўваюць у Віцебскі абласны дзіцячы клінічны цэнтр для паглыбленай дыягностыкі, кансерватыўнага ці аперацыйнага лячэння.

З 2016-га да 2019 года агляды ў межах праекта «Я бачу!» прайшлі сельскія школьнікі ў Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях. За гэты час афтальмолагі праверылі зрок у 36 800 дзяцей. Больш чым 33 % з іх мелі розныя паталогіі. Прычым у больш чым у паловы яны выяўлены ўпершыню — менавіта падчас агляду мабільнымі брыгадамі.

— Праект «Я бачу!» закліканы зрабіць афтальмалагічную дапамогу больш даступнай для дзяцей, якія жывуць у сельскай мясцовасці, — кажа **дырэктар Беларускага дзіцячага фонду Аляксандр ТРУХАН.** — Эфект ад такой дапамогі вялікі: чым раней парушэнні зроку будуць выяўлены ўрачом, тым больш шанцаў не дапусціць развіцця сур'ёзных паталогій у будучыні.

Усе выдаткі, звязаныя з работай мабільных афтальмалагічных брыгад, уключаючы закупку неабходнага абсталявання, аплату працы медыкаў і кіроўцаў, фінансуе Беларускі дзіцячы фонд са сродкаў, сабраных кампаніяй velcom / A1 падчас традыцыйнай дабрачыннай акцыі «Рабіць дабро так проста!». Дарэчы, сёлета сума дабрачыннай дапамогі склала 176 920 рублёў.

— Кампанія velcom / A1 падтрымлівае праект ужо чацвёрты год. І за гэты час мы дасягаем вынікаў не толькі ў пэўным рэгіёне, але і ва ўсёй краіне. У гэтым нам дапамагае актыўная сацыяльная інфармацыйная кампанія па прафілактыцы хвароб органа зроку і захаванні здароўя вачэй. У яе межах мы ўжо звярталі ўвагу на неабходнасць рэгулярнай зарадкі для вачэй, правільнага і максімальна карыснага харчавання, важнасць своечасовага звароту да афтальмолагаў і выканання іх рэкамендацый, — падкрэслівае **начальнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі velcom / A1 Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ.**

Паводле даных Міністэрства аховы здароўя, за апошнія пяць гадоў захвараль насць органа зроку ў дзяцей вырасла на 18 %. Таму роля сучаснай дыягностыкі і кантролю за парушэннямі, якія ўжо маюць месца, набывае асаблівае значэнне.

Сарамлівасць, якая перашкаджае жыць

Як яе перамагчы?

Наўрад ці знойдзецца шмат людзей, якія будуць сцвярджаць, што ім не знаёмыя баязлівасць ці сарамлівасць. Часцей за ўсё гэтыя пачуцці ўзнікаюць у нас яшчэ ў дзяцінстве, прычыняючы безліч праблем. Нават выдатнікі нярэдка чырванеюць перад класам, баяцца і пазбягаюць адказаў каля дошкі. І гэта пачуццё нярэдка пераходзіць з намі ў дарослае жыццё, не даючы раскрыцца ў поўнай меры — ці гэта будзе неабходнасць выступіць перад аўдыторыяй або патрэба растлумачыць сваю пазіцыю перад калегамі ці ў кампаніі незнаёмых людзей. Як сарамлівасць псуе наша жыццё (і ў якіх выпадках яна нам на руку) і ў чым яе небяспека, расказала псіхолаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска Таццяна ДАЎЖЭНКА.

ДОБРА ЦІ ДРЭННА?

— Яшчэ ў маленстве дзіця пачынае ўсведамляць, што за ім назіраюць, яго абмяркоўваюць і ацэньваюць. Па меры свайго сталення яно вучыцца кантактаванню. Праўда, не заўсёды працэс ідзе паспяхова. І некаторыя людзі да канца сваіх дзён застаюцца хваравіта сарамлівымі, — тлумачыць Таццяна Іванаўна. — Гэта, канешне, ускладняе жыццё, ствараючы перашкоды на працы, ва ўзаемаадносінах з людзьмі, у стварэнні сям'і і, нарэшце, у тым, каб быць шчаслівымі. Зразумела, сарамлівасць не лічыцца хваробай. Больш за тое, у меру сарамлівыя людзі ўспрымаюцца навакольнымі з сімпатыяй. Але ўсё ж паталагічная сарамлівасць вельмі перашкаджае ў жыцці.

Заніжаная самаацэнка і боязь паказацца смешным у вачах навакольных — вось чым тлумачыцца сарамлівасць. Такія людзі звычайна могуць кантактаваць з добрымі знаёмымі, а перад незнаёмцамі губляюцца і не могуць выціснуць ні слова. І пачынаецца ўсё ў дзяцінстве, калі адбываецца эмацыянальнае станаўленне, і тут многае залежыць ад сямейнага акружэння і прыкладу бацькоў.

— Не трэба быць залішне патрабавальным да дзяцей, — раіць спецыяліст. — Да таго ж варта засцерагаць іх ад празмернага знаходжання ў кіберпрасторы, якая стымулюе з'яўленне сарамлівасці і баязлівасці, пазбаўляючы дзяцей навыкаў сапраўдных зносін.

У ЧЫМ НЕБЯСПЕКА?

Па-першае, у тым, што сарамлівасць адбірае ў чалавека значную частку яго інтэлектуальных рэсурсаў. У галаве ў сарамлівага чалавека сядзіць «цэнзар», «наглядчык», які кажа, «правільна» ён сябе паводзіць ці не. Гэты суддзя, пасаджаны туды, як правіла, бацькамі, пераследуе чалавека ўсё жыццё. Калі вы пазбавіцеся ад яго, вы пазбавіцеся ад сарамлівасці. Вучыцеся майстэрству спакойна і аб'ектыўна бачыць сябе збоку — без ацэнак і асуджэння. Уносьце ў стаўленне да сябе лёгкую адцягненасць і мяккі гумар. Падсмейвайцеся са сваёй няўпэўненасці і сарамлівасці.

Па-другое, сарамлівы чалавек пастаянна маніторыць сітуацыю, стараючыся вызначыць, якое ўражанне ён пакідае ў навакольных. Унутры пастаянна адбываецца дыялог са сваім «наглядчыкам»: што можна рабіць, а чаго нельга? А што яны пра мяне падумаюць? Уважліва паназірайце за ўпэўненымі і разняволенымі людзьмі. Пастарайцеся зразумець, у чым сакрэт іх поспеху і як ім удаецца трымаць сябе свабодна і ўпэўнена ва ўсіх сітуацыях. Падумайце, ці няма ў вас хаця б якіх-небудзь зародкаў такой упэўненасці? Калі так, то зноў і зноў настройвайцеся на такі стан, замацоўваючы яго. Падумайце таксама, здольныя вы на ўчынкі, якія робяць гэтыя людзі, ці не. Паспрабуйце паводзіць сябе гэтак жа, як яны, — без аглядкі на навакольных.

Аддайце ўвагу вызваленню ад цяглічных заціскаў. Сарамлівасць проста перастае існаваць як якасць, калі чалавек навучыўся расслабляць сваё цела. Кожная грань сарамлівасці мае сваю цяглічную праяву. Вывучыце цяглічны малюнак сваёй сарамлівасці. Пастарайцеся зразумець, якія групы цягліц з'яўляюцца галоўнымі сіламі, што падтрымліваюць гэты адмоўны эмацыянальны стан.

НАСТУПСТВЫ САРАМЛІВАСЦІ

Сарамлівыя людзі закрыты ад навакольных. А для таго, каб усталяваць блізкія адносіны, важная адкрытасць. Разам з тым усе маюць патрэбу ў блізкіх адносінах. Але сарамлівы чалавек ідзе на збліжэнне вельмі марудна, старанна намацваючы глебу. І калі такое збліжэнне адбылося, ён ім вельмі даражыць. Нават не таму, што каштоўны сам партнёр, а, хутчэй, таму, што яго страта прывядзе да неабходнасці шукаць новага. Гэтым і тлумачыцца той факт, што ў сарамлівых людзей часта адносіны з сябрамі, дакладней сябром, «цягнуцца» ледзь не са школы, а таксама існуе схільнасць «зацыклівацца» на сексуальным партнёры: ён баіцца, што больш нікога не знойдзе.

Сарамлівыя людзі схільныя да злоўжывання алкаголем. Такім чынам яны імкнуцца зняць напружанне, прыбраць бар'еры, каб адчуваць сябе больш свабодна. Часам такія людзі схільныя і да гвалту. Такі чалавек звычайна не праяўляе сваіх пачуццяў. Яны паступова назапашваюцца і праз нейкі час выліваюцца ў выглядзе неадэкватнай агрэсіі. Навакольным такія паводзіны здаюцца незразумелымі, хоць яны заўсёды маюць глыбокую прычыну.

У любым выпадку ад сарамлівасці лепш пазбаўляцца, тым больш што ёсць тэхнікі, якія дазваляюць гэта зрабіць, і спецыялісты-псіхолагі, якія могуць дапамагчы.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

З людзьмі і сам-насам

МЫ — ТРОЙЧЫ ДЗЕЦІ Ў ВЕЧНЫМ КРУЗЕ...

І сапраўды — з Паэтам не паспрачаешся: «...мы — дзеці роднае сям'і, / І — дзеці маці-Беларусі, / І — дзеці Матухны-Зямлі», на якой ці не ў кожнага ёсць найлепшы куточак. Нехта заве яго прыгожа і досыць гучна — «мая Бацькаўшчына», нехта — куды цішэй — малая (альбо гістарычная) радзіма ці проста — вёска, якая вабіць, якая ратуе і за якую так часта баліць душа... Сведчаннем таму рэдакцыйная пошта: у ёй, як заўжды, ёсць лісты ад людзей, якія «сто гадоў» не пісалі (а ў рэдакцыю — і пагатоў!), ёсць, наадварот, ад тых, чые пісьмы пазнаюцца здалёк — па почырку.

«Мне 91 год, — прызнаецца адна з найстарэйшых, відаць, падпісчыц «Звязды» **спадарыня Ніна Гапоненка з вёскі Броннае Рэчыцкага раёна,** — *і за гэты час я рабіла многае: вучылася, працавала, гадавала дзяцей і ўнукаў, шмат займалася грамадскай дзейнасцю. Але ж ёсць і тое, чаго не паспела. Зараз мне вельмі хочацца напісаць успаміны пра вёсачку, дзе нарадзілася, дзе пайшла ў першы клас, дзе пачынаючы з 1840 года жылі ўсе мае прадзеды. Вёску гэту немцы спалілі, дзеда забілі за сувязь з партызанамі, а вось яго брат да 1957 года жыў там у зямлянцы — не хацеў нікуды з'язджаць, бо там нарадзіўся...»*

Пра гэта, згадзіцеся, варта і трэба расказваць не толькі родным дзецям-унукам. Пра гэта ***варта і трэба напісаць,*** бо словы прамоўленыя (нават самымі блізкімі, самымі роднымі людзьмі) маюць уласцівасць забывацца, сцірацца з памяці. Напісанае — застаецца. Часам — свайго роду помнікам.

«Мне пашчасціла гасцяваць, прычым не раз, на Паўднёвым Палессі, і хоць было гэта даўным-даўно, я да сёння чую спеўную гаворку, памятаю самабытныя слоўцы, накшталт: тато, мамо, вадро, вароўка, гіч (гэта бульбоўнік), зернета (гарбузовыя семкі)... Што ўжо казаць пра людзей!» — піша **спадарыня Наталля Сівак з вёскі Заполле Чэрвеньскага раёна.** І апавядае, што жылі палешукі ў прасторных дамах на чатыры ці пяць пакояў, што галоўныя вокны выходзілі не на вуліцу, а ў двор. («Прачнешся раніцай, — з усмешкай казалі гаспадары, — і адразу бачыш: сена цэлае, жывёлу ваўкі не скралі».)

Зачароўвала прыгажосцю і ўнутранае ўбранства хат: саматканыя посцілкі-палавікі, дываны і дыванчыкі, вышыванкі... Крамных, фабрычных ручнікоў амаль не было... *«На адзін, саматканы, з печы па раніцах «ляцелі» бліны, якія адразу накрываліся другой паловай ручніка. Магчыма, таму і праз гадзіну яны былі цёплыя, а да вечара — мяккія. І наогул часта-валі там лепш, чым у добрым сталічным рэстаране»,* — прыгадвае спадарыня Наталля.

«Помню, суседзі, адпраўляючы ў войска сына, ладзілі бяседу. У хаце, як той казаў, — карціна алеем: сталы ў два рады і свабоднага месца на іх нямашака. Прычым з куплёнага там хіба хлеб, а вось хатняга дык проста не злічыць: калдуны, галубцы, катлеты, сцюдзень, рулеты, паляндвіцы, стравы з рыбы, грыбоў, вельмі шмат бліноў, блінцоў ды блінчыкаў, караваяў і каравайчыкаў — і з начынкай і без... Урэшце — ладныя кавалкі жоўценькага масла. Ім там «заядалі» моцны алкаголь. Так, маўляў, і для страўніка карысней, і не сп'янееш... А значыць, потым — паспяваеш (ці хоць паслухаеш) непаўторныя палескія песні альбо станцуеш пад музыку вясковага духавога аркестра...»

Што ў памяці, — вельмі многія стравы падаваліся ў гліняным посудзе: у гарлачах і гарлачыках, місках, макатрах...

Шыкоўна выглядала і самаробная мэбля: шафы, канапкі, касінчыкі (вуглавыя паліцы). Усё гэта рабілася з вялікім густам, без ніякіх цвікоў, з прыгожага цэльнага дрэва. І зноў жа не пакрывалася ні фарбай, ні лакам, бо гэта, казалі, дрэва, яно павінна дыхаць...

«А вось адсутнасці штор на вокнах я не разумела», — прызнаецца спадарыня Сівак і расказвае, як аднойчы падабрала прыгожую тканіну, пашыла шторы, прывезла і са згоды гаспадароў занавесіла вокны. Абноўка, як выглядала, прыйшлася даспадобы: ёй шчыра падзякавалі. Аднак месяцы праз тры, калі зноў давялося наведаць той дом, госця ўбачыла, што яе падарунка на вокнах няма: ёсць ранейшыя маленькія беленькія фіранкі. Далікатна папыталася чаму. І пачула: «Так болей святла... Сапраўднага...»

«Там і сапраўды сапраўдным было ўсё, — працягвае спадарыня Наталля. — *Менавіта было, бо потым, калі ў наша Заполле перасялілі амаль два калгасы з чарнобыльскай зоны, многае з нажытага (мэблю, рэчы...) людзі папрывозілі з сабой. Дазіметры, што называецца, зашкальвалі, таму ў хуткім часе гэту непаўторную прыгажосць сталі выносіць на вуліцу, а ўрэшце — паліць... І зноў дазіметры «крычалі», а людзі плакалі, як плачуць да сёння, бо ўсю тую сапраўднасць пагубіла чарнобыльская радыяцыя».*

А недзе і без яе...

«Той, хто ездзіў з Брэста ва Украіну, — піша **спадар Іван Гаральчук з Мінска,** — *ведае вёску Макраны. Яна — амаль на мяжы з усімі яе атрыбутамі: з тэрміналамі, пагранперахадам... У савецкі час іх, вядома ж, не было: быў вялікі парк, дзе ў святы ядналіся і народы, і асобныя людзі: жаніліся, кумаваліся, сябравалі. Былі яшчэ і кірмашы...*

Усё парушылася цягам цяжкіх 90-х. На месцы парку з'явіліся мытнікі і так званыя пагранцы. Па абодва бакі ад іх жыццё змянілася, і Беларусь, трэба сказаць, апынулася ў лепшым становішчы. Ведаючы, як складана зарабіць тую ж капейку ў сябе на радзіме, да нас пацягнуліся суседзі.

А вось дзеці карэнных макранцаў, паводле спадара Гаральчука, наадварот, — прадоўжылі з'язджаць. І прычын таму шмат: людзей, па-першае, не задавальняюць тутэйшыя заробкі, па-другое, вырашэнне праблемы з жыллём: тобок прыезджым, якія ў вёсцы ніякага жылля не маюць, выдзяляюцца добраўпарадкаваныя дамы з надворнымі пабудовамі. А вось у мясцовых ёсць бацькоўскія хаты. І ніхто не глядзіць, колькі ім гадоў, не лічыць, колькі грошай трэба ўкласці, каб давесці такое жытло да ладу...



Па-трэцяе, ёсць праблемы з транспартам, з кадрамі на ФАПе... Пустуе і вялікі Дом культуры, у якім некалі выступалі артысты з Мінска, Масквы, Кіева ды меншых гарадоў. Цяпер установе патрэбен рамонт.

«А вось сена не патрэбна амаль нікому, — піша спадар Гаральчук, — *бо вяскоўцы, можна сказаць, не трымаюць кароў. Праўда, трава аб гэтым не ведае і таму расце вельмі хутка. На пытанне начальства, чаму не скошана, вяскоўцы (пад страхам штрафу) абяцаюць, што зробяць гэта, як толькі прыедзе сын, зяць, сват... Тыя, хто не мае радні, ходзяць па вёсцы ў пошуках касцоў (вядома ж, за грошы).*

У іншых месцах няма падобных праблем: людзям аказваюць усе неабходныя паслугі, нават з касьбой: узбочыны дарог абкошваюцца за кошт гаспадарак, падворкі — за кошт насельніцтва, непатрэбнае сена ці трава звозяцца на фермы... Але ж у нас пакуль не так. І мне, напрыклад, цікава: дзе для Беларусі жыццё больш тыповае — у аграгарадку Макраны, ці, напрыклад, у аграгарадку Сноў?

Як пісаў нехта з класікаў, усюды людзі, усюды жыццё — сваё, адметнае.

Набалелым (без перабольшання) падзяліўся ў сваім лісце і **спадар В. С. з Іўеўшчыны.** Напісаў, як цяжка перажываў страту жонкі, як адчуў сябе лішнім... у сваёй жа кватэры. *«Пачалося з таго,* — піша ён, — *што сям'я сына паставіла мне асобны тэлевізар: сядзі, маўляў, у сваім пакоі, глядзі, што хочаш і калі хочаш, а да нас не лезь... Потым нявестцы не спадабаўся жарт аднаго з маіх сяброў, і яна забараніла мне (!) каго-небудзь запрашаць без яе дазволу. Унукам я таксама быў непатрэбны...»*

Карацей, сяк-так чалавек перажыў зіму і падаўся ў вёску, на малую радзіму жонкі. Родзічаў, як прызнаецца, там амаль не засталося, але ж ён апынуўся сярод блізкіх людзей, якія, пачуўшы, што прыезджы хацеў бы затрымацца, дапамаглі падключыць балон, паклеіць шпалеры, завесці гаспадарку з ката і сабакі, пасадзіць бульбы.

«Так што цяпер я, можна сказаць, вясковец, — прызнаецца спадар С. — *І калі здараецца прыехаць у Мінск, стараюся як мага хутчэй з'ехаць, хоць горад мне і падабаецца... За апошнія тры гады перасталі падабацца гараджане — спахмурнелыя, вечна занятыя пошукам не то грошай, не то шчасця... І толькі тварыкі дзяцей дазваляюць мне спадзявацца, што з цягам часу яны сумеюць дасягнуць душэўнага спакою і волі для найлепшых сваіх памкненняў, будуць шчаслівымі. У прыгожым горадзе альбо ў вёсцы — не так ужо і важна. Важна, каб сярод добрых людзей».*

Піша пра іх і **спадарыня Ірына Матусевіч з Дзяржыншчыны.** *«Я сумую па вёсцы,* — прызнаецца яна, — *той, ранейшай, звонкагалосай, гаманлівай. Хоць, па праўдзе кажучы, наша паселішча не такое маўклівае і цяпер: вясной, асабліва ў выхадныя, паўсюль прыкметнае ажыўленне, дзелавітая мітусня. Не сёння — заўтра пацяплее і загрыміць музыка, запахне шашлыкамі, на вуліцах стане больш машын і людзей... Але кожны раз я лаўлю сябе на думцы, што ва ўсім гэтым вельмі мала ад сапраўднай вёскі, якой яна была, калі поўнілася гукамі стваральнай працы.*

Не, большасць маіх аднавяскоўцаў, — як сталых мясцовых жыхароў, так і прыезджых, — руплівыя, працавітыя: даглядаюць свае дамы і надворкі, завіхаюцца на гародах.

Ды ўжо колькі гадоў не вяртаюцца з пашы каровы: на ўсю нашу вёску засталіся толькі тры ці чатыры рагулі. «Не плывуць» па вуліцы і вазы з сенам; не спяшаюцца ў поле, на падмогу бацькам, падлеткі. Ды і каму спяшацца, калі ў школе, можа, вучняў з дваццаць.

Аднак галоўнае, як мне здаецца, не толькі ў знешніх праявах, а ў тым, што спакваля, непрыкметна мы страчваем душу вёскі. Дзе, як не тут, спрадвеку жыло наша слова. Цяпер жа сельскія дзеці размаўляюць у асноўным па-руску, а пакаленне, якое магло б перадаць ім жывую народную гаворку, паступова адыходзіць....

Дзе, як не ў вёсцы, выхоўваліся найлепшыя чалавечыя якасці. Адзін з галоўных законаў вясковай маралі: «знаёмы ці незнаёмы табе чалавек — заўжды павітайся». І шкада, што пра яго ці наўмысна, ці незнарок забываюцца часам нават свае, «сельскія гараджане», што ўжо казаць пра ўладальнікаў дачных сядзіб?

Магчыма, камусьці мае разважанні пададуцца занадта мінорнымі, — падсумоўвае спадарыня Ірына. — *Маўляў, не варта сумаваць па «леташнім снезе»: мяняецца час — мяняецца жыццё, у тым ліку вясковае. І ўсё ж я шчыра веру: беларуская вёска, багатая сваім мінулым, не застанецца без будучыні. Бо покліч роднай зямлі — не проста прыгожыя словы, а генетычна абумоўленая неабходнасць. Ды і ўявіць нашу нацыю, сялянскую па сваёй сутнасці, без вёскі... Мне здаецца, гэта немагчыма».*

Вось такія лісты, такія развагі. Маеце нешта дадаць? Калі ласка.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Свой погляд

«Мала навесці марафет у сталіцы...»

Беларусь рыхтуецца да правядзення II Еўрапейскіх гульняў, многае робіцца, каб паказаць, што мы здольны прымаць такія мерапрыемствы, але...

Вядома, напрыклад, што большасць гасцей будзе ехаць на цягніках, на машынах праз Гродна, Брэст, Маладзечна, расіяне — праз Оршу, нехта з Украіны — праз Гомель.

Я жыву ў Баранавічах. І калі еду электрычкай з Мінска альбо ў Мінск, то няўзброеным вокам бачу шматлікія хібы. Возьмем станцыю Памыслішча: кепскі перон, трэба паднавіць асфальт. Далей станцыя Койданава. Там, непадалёк ад чыгункі, размешчана нейкае прадпрыемства, на тэрыторыі — трубы, жалеза і г. д. На добры толк усё гэта трэба было б альбо прыбраць, або абнесці якой агароджай. Каля асобных прыватных дамоў парадку няма, дзе-нідзе на ўзлесках, добра бачных з дарогі, таксама ляжаць дрэвы...

Вось і думаю, што, можа, варта было б некаму праехацца шляхамі, што вядуць у Мінск, зафіксаваць недахопы, а потым і выправіць?

Можна яшчэ на месцах стварыць маладзёжныя валанцёрскія атрады, якія дапамогуць старым і нямоглым гаспадарам навесці парадак ля сваіх прыватных дамоў. Час на гэта пакуль шмат ёсць. І як на мой погляд, дык мала навесці марафет у самой сталіцы. Трэба, каб удзельнікі Гульняў, турысты, аматары спорту, якія прыедуць да нас, убачылі ўсю Беларусь утульнай і чыстай.

Аляксандр Пятруннікаў,
г. Баранавічы.